*ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 11 (1237) ● 29 сакавіка 1979 г.

Цана 2 кап.

## ФАРМІРАВАННЕ АКТЫЎНАЙ ПАЗІЦЫІ

**«Нішто так не ўзвышае асобу,— гаварыў з трыбуны XXV з'езда КПСС Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў,— як актыўная жыццёвая пазіцыя, свядомыя адносіны да грамадскага абавязку, калі адзінства слова і справы становіцца паўсядзённай нормай паводзін». Сучасны этап камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне прад'яўляе асабліва высокія патрабаванні да ідэйнай сталасці, творчай актыўнасці маладога спецыяліста, студэнта, да ўмення прымяняць у жыцці атрыманыя ім веды.**

**Вялікую ролю ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і разам з тым актыўных асоб адыгрывае грамадска-палітычная практыка студэнтаў.**

**Працэс навучання і выхавання высокакваліфікаваных кадраў вельмі складаны. Гэта творчая праца, патрабуючая бесперапыннага ўдасканальвання, пошукаў новых форм і метадаў. У гэтым плане выключна важную ролю адыгрывае правільна арганізаваная грамадска-палітычная практыка, якая заклікана навучаць будучага спецыяліста быць грамадска актыўным, набыць ужо ў сценах універсітэта навыкі, вопыт арганізатарскай, лекцыйнай, прапагандысцкай работы, дапамагчы выканаць ленінскі запавет «вучыцца камунізму».**

## НАШЫ ВЫНІКІ

Грамадска-палітычная атэстацыя ўжо даўно прызнана дзейсным сродкам праверкі актыўнасці камсамольцаў. Аднак гэта агульнае сцвярджэнне патрабуе пацвярджэння фактамі. Звернемся да вынікаў ГПА на гістарычным факультэце.

З 617 камсамольцаў факультэта атэставана 92 працэнты: на «выдатна» — 49,5 працэнта, «добра» — 17 працэнтаў, «здавальняюча» — 1,5 працэнта, «залічана» (першакурснікі — 24 працэнты). Не атэставана 8 працэнтаў, з іх па хваробе — 6 працэнтаў, па акадэмічных запазычанасцях — 2 працэнты.

Трэба адзначыць, што палавіна камсамольцаў атэставана найвышэйшай адзнакай. У параўнанні з мінулым годам відаць рост (з 44 працэнтаў да 49,5 працэнта). Не падвялі нас у гэтым годзе і першакурснікі. Аднак у ходзе ГПА выявіліся і многія недахопы. Звернем увагу на найбольш значныя з іх.

Старшакурснікі ўспамінаюць аб сваіх уласных комплексных планах тады, калі надыходзіць час ГПА. На жаль, кантроль за ходам выканання комплексных планаў яшчэ не наладжан.

Камісіі, састаўленыя з прадстаўнікоў камітэта камсамола, парткома і куратараў, часта недастаткова добра ведаюць людзей. Такім чынам, галоўнай асобай, прадстаўляючай атэстуемага, з'яўляецца камсорг, які, на жаль, не заўсёды аб'ектыўны.

Члены камісіі, недастаткова добра ўяўляючы задачы ГПА, асноўны ўпор робяць на аналіз паспяховасці, не ўдзяляючы такой жа ўвагі выконваемай грамадскай рабоце.

Скоўвае работу атэстацыйнай камісіі і ўплывае на аб'ектыўнасць ацэнкі і тое, што ацэнка па ГПА ўлічваецца пры размеркаванні стыпендыі.

Сказваецца і пагоня за добрымі паказчыкамі. Імкненне паказаць факультэт лепш прыводзіць да таго, што працэнт атэстуемых не падае ніжэй 97, нягледзячы на значныя якасныя перамены ў саставе камсамольскай арганізацыі.

Усё гэта прыводзіць да таго, што камсамольцы часам ідуць на ГПА не як на сур'ёзны экзамен, а як на занятак, які адымае шмат часу, тым больш, што вынікі амаль заўсёды вядомы наперад.

У цяперашні час камітэт камсамола заняты распрацоўкай практычных мер па ліквідаванню вызначаных недахопаў. У гэтым яму актыўна дапамагае партбюро. Час і практыка прад'яўляюць новыя патрабаванні да форм і метадаў ГПА. Ідзе пошук аптымальных варыянтаў. Карыстаючыся выпадкам, хачу звярнуцца да сваіх калег па камсамольскай рабоце з просьбай падзяліцца вопытам правядзення ГПА на сваіх факультэтах.

Неабходна падкрэсліць, што, нягледзячы на цяжкасці, няўдачы, ГПА даказала сваю жыццёвасць.

**І. ВЕЛІЧАНСКІ,**
**студэнт IV курса гістфака.**

## ГПА—на першым курсе

Атэстацыя, праведзеная нядаўна ў трэцяй групе I курса юрыдычнага факультэта, стала сведчаннем таго, што група наогул добра паспявае ў вучобе і грамадскай рабоце, яна — дружны і згуртаваны калектыў. Камсамольцы задавалі тон пры атэстацыі, па-дзелавому адзначаючы станоўчыя і негатыўныя бакі ў вучобе і ў характары кожнага атэстуемага студэнта. Самымі лепшымі і ініцыятыўнымі аднадушна былі прызнаны камсамольцы Н. Камісараў, Н. Гамбарава, В. Забаронак, С. Трапук і іншыя.

Але атэстацыя выявіла і недахопы. З шасці груп I курса трэцяя група займае толькі чацвёртае месца па паспяховасці. Ініцыятыўнымі і паспяваючымі звычайна сярод студэнтаў лічацца камуністы, у 3-й жа групе — наадварот. З 5 студэнтаў, якія займаюцца даволі пасрэдна, чацвёра — камуністы (А. Квасноў, Л. Шкурская, В. Карыцька, В. Малашанка). Сваю непаспяховасць яны тлумачаць вялікім перапынкам у вучобе (паміж школай і ВНУ), недахопам вопыту, пропускамі заняткаў.

Падводзячы вынікі атэстацыі, камісія звярнула ўвагу на тое, што не ўсе студэнты займаюцца роўна. Адны з іх ініцыятыўныя і ў вучобе, і ў грамадскай рабоце. Так, Н. Гамбарава, паспяваючы ў вучобе, вельмі добра наладзіла культмасавую работу ў групе. Па яе ініцыятыве студэнты часта наведваюць музеі, тэатры, ходзяць у кіно.

Іншыя студэнты, добра паспяваючы ў вучобе, інертныя ў грамадскай рабоце. Ёсць у групе і такія, хто не мае пастаянных даручэнняў. Індывідуальныя планы іх не канкрэтызаваны, не ўсё запланаванае выконваецца поўнасцю і якасна. Яны мала чытаюць, асобныя студэнты нават не маглі назваць ніводнага мастацкага твора, прысвечанага прафесіі юрыста.

Тэматычныя інфармацыі ў групе — рэдкая з'ява, дрэнна асвятляецца жыццё групы ў насценным друку.

Канешне, многія недахопы ў рабоце групы можна растлумачыць нявопытнасцю, бо прайшла толькі першая ў жыцці студэнцкая экзаменацыйная сесія і першая атэстацыя. Але хочацца верыць, што для першакурснікаў яны паслужылі добрым урокам. Партбюро, камітэту камсамола, прафбюро і куратару неабходна таксама ўдасканаліць формы грамадскай работы ў групах, акцэнтуючы ўвагу на індывідуальнай рабоце з кожным студэнтам.

**Э. КАЛІНІНА.**





**Правядзенне тыдняў савецка-в'етнамскай дружбы ва універсітэце даўно ўжо стала традыцыяй. Яго праводзіць на базе механіка-матэматычнага факультэта камітэт камсамола БДУ разам з В'етнамскім зямляцтвам і камсамольцамі Мінскага камвольнага камбіната. На працягу Тыдня савецкія студэнты больш падрабязна азнаёмяцца з жыццём, гісторыяй, гераічнай барацьбой брацкай краіны. Прадстаўнікі моладзі В'етнама ў сваю чаргу яшчэ больш даведаюцца аб савецкай рэчаіснасці.**

**Зараз правядзенне Тыдня савецка-в'етнамскай дружбы асабліва падкрэслівае нашу салідарнасць са змагаючымся В'етнамам. На яго баку — перамога, на яго баку — праўда.**

**Аб гэтым гаварылі ўсе, хто выступіў на мітынгу, прысвечаным адкрыццю Тыдня: член камітэта камсамола мехмата, адказная за інтэрнацыянальнае выхаванне Лілія Орсіч, ветэран вайны і працы работніца камвольнага камбіната Аляксандра Іванаўна Ільіна, супрацоўнік факультэта, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксандр Саламонавіч Мізрахі, намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта Мікалай Прыгодзіч.**

**Ад імя в'етнамцаў, якія навучаюцца ў Мінску, выступіў аспірант ФПМ То Туан.**

**Пасля мітынгу лепшыя савецкія і в'етнамскія студэнты ўсклалі кветкі да помніка У. І. Леніну.**

**Тыдзень савецка-в'етнамскай дружбы працягваецца. У яго праграме — сумеснае наведванне тэатраў і ВДНГ БССР, вечар, прысвечаны Дню стварэння Саюза камуністычнай моладзі Хо Шы Міна, сустрэча з Героем Савецкага Саюза А. Г. Мазанік, спаборніцтвы па шашках, шахматах, настольнаму тэнісу і г. д.**

**У час Тыдня быў узноўлен трохбаковы дагавор аб супрацоўніцтве паміж студэнтамі БДУ, В'етнамскім зямляцтвам і камсамольцамі камвольнага камбіната.**

Фота **М. Дубовіка.**

## Весткі з факультэтаў

### Мехмат

Даўнія і трывалыя сувязі ўсталяваліся паміж студэнтамі III курса шостай групы мехмата Т. Кукса, І. Сялява, А. Крывіцкай, Г. Валькоўскай і 20-й групай III курса ГПТВ № 114. Студэнты часта сустракаюцца, праводзяць сумесныя вечары, «агеньчыкі», экскурсіі, паездкі, абмяркоўваюць новыя кнігі. А нядаўна мехматаўцы запрасілі сваіх сяброў на факультэт, пазнаёмілі з гісторыяй універсітэта, расказалі аб сваіх справах і поспехах.

У пачатку сакавіка ў камітэт камсамола механіка-матэматычнага факультэта прыйшла падзяка з прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 114 г. Мінска за добрую шэфскую работу студэнтаў.

### Юрфак

Дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі дзяржавы і права Эльза Аляксееўна Калініна вырашыла падарыць юрфакаўцам 4-е выданне Поўнага збору твораў У. І. Леніна з уласнай бібліятэкі.

Камітэт камсамола плануе змясціць кнігі вялікага правадыра ў ленінскім пакоі інтэрната. Гэта забяспечыць і рацыянальны доступ да іх, і найбольшую аўдыторыю чытачоў.

**І. ЕМЕЛЬЯНОВІЧ.**

### Журфак

На вечары сустрэчы з членамі клуба турыстаў-альпіністаў універсітэта прысутныя слухалі расказы турыстаў аб паходах на Каўказ, Палессе, Камчатку, Паўночны Урал. Быў прадэманстраван фільм аб Карпатах, зняты кінааматарамі. У сваю чаргу журфакаўцы падрыхтавалі да гэтай сустрэчы канцэрт і віктарыну. Свае вершы чыталі А. Усеня, Т. Чарнавус і іншыя.

***

Нядаўна закончыўся першы ў гісторыі факультэта турнір па футболу на снезе. Чэмпіёны — студэнты чацвёртага курса. Гэта своеасаблівая рэпетыцыя перад трэцім традыцыйным турнірам, які адбудзецца ў сакавіку гэтага года на прыз насценнай газеты «Журналіст».

### Фізфак

Паміж камітэтам камсамола фізічнага факультэта і гарадскім зямляцтвам ЧССР быў падпісан дагавор аб супрацоўніцтве. Сярод праведзеных сумесных мерапрыемстваў можна адзначыць Тыдзень дружбы, у час якога праводзіліся гутаркі, прагляд кінафільмаў, хакейны матч, у якім перамаглі студэнты фізічнага факультэта.

**Т. ІЎКІНА.**

# Абавязацельствы выканалі

Намаганні шматтысячнага калектыву Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна ў трэцім годзе дзесятай пяцігодкі былі накіраваны на далейшае расшырэнне сацыялістычнага спаборніцтва, на ўмацаванне і памнажэнне дасягнутых поспехаў, на далейшае ўдасканаленне якасці падрыхтоўкі і выхавання маладых спецыялістаў.

На сходзе актыву БДУ, які адбыўся 23 сакавіка, былі падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва калектыву універсітэта за 1978 год. З дакладам на сходзе выступіў прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце А. Я. Малышаў. Ён падкрэсліў, што калектыў старэйшай ВНУ рэспублікі паспяхова выканаў узятыя на сябе сацыялістычныя абавязацельствы.

Былі вызначаны пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва сярод факультэтаў і агульнауніверсітэцкіх кафедр, а таксама падраздзяленні, якія сталі пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва асобных калектываў універсітэта.

Рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы павіншаваў калектыў універсітэта з паспяховым выкананнем сацыялістычных абавязацельстваў і заклікаў усіх студэнтаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікаў і аспірантаў настойліва змагацца за ажыццяўленне рашэнняў XXV з'езда КПСС, шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва за паспяховае выкананне заданняў і планаў чацвёртага года дзесятай пяцігодкі.

Пераходны Чырвоны сцяг і Ганаровая грамата рэктарата, парткома, мясцкома універсітэта былі ўручаны біялагічнаму факультэту, занятўшаму першае месца.

Хімічнаму, фізічнаму і гістарычнаму факультэтам які занялі па выніках сацыялістычнага спаборніцтва другое і трэцяе месцы, уручаны вымпелы «Пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва» і Ганаровыя граматы рэктарата, парткома і мясцкома універсітэта.

Вымпелы «Пераможцу сацыялістычнага спаборніцтва» і Ганаровыя граматы рэктарата, парткома і мясцкома ўручаны таксама тром агульнауніверсітэцкім кафедрам (педагогікі, гісторыі філасофіі і логікі і палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў), занятўшым тры першыя месцы.

Ганаровымі граматамі рэктарата, парткома і мясцкома ўзнагароджаны кафедры: фізікі паўправаднікоў, ядзернай фізікі і мірнага выкарыстання атамнай энергіі, ЭММ, вышэйшай матэматыкі, тэорыі функцый, алгебры, неарганічнай хіміі, мікрабіялогіі мацерыкоў і акіянаў, гісторыі БССР, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, беларускай літаратуры, крымінальнага права, нямецкай мовы, марксісцка-ленінскай філасофіі ІПК. Ганаровымі граматамі ўзнагароджаны таксама: аддзел дыялогавых сістэм ВЦ, бібліятэка юрыдычнага факультэта, вучэбна-вытворчыя майстэрні, рэдакцыя літаратуры па філалогіі, журналістыцы і педагогіцы і рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выдавецтва БДУ, канструктарскі аддзел № 25, тэхналагічны аддзел № 5, механічны ўчастак і слясарна-зборачны ўчастак СКТБ з ВВ, калектывы інтэрната № 1 і вучэбнага корпуса філалагічнага факультэта, сектар АСУ—БДУ навукова-даследчага аддзела.

За дасягнутыя поспехі ў падрыхтоўцы спецыялістаў, навукова-даследчай рабоце, у арганізацыі працы, быту і адпачынку студэнтаў, матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні вучэбнага працэсу больш 60 выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта ўзнагароджаны знакам «Ударнік камуністычнай працы». Шэраг выкладчыкаў і супрацоўнікаў узнагароджаны знакам «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва 1978 года».

Сход актыву аднагалосна прыняў сацыялістычныя абавязацельствы калектыву універсітэта на 1979 год.

# ДА НОВЫХ

(ВЫНІКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

НА лістападаўскім (1978 г.) Пленуме ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў адзначаў: «Мы распалагаем і такім выпрабаваным рычагом памнажэння працоўных поспехаў, як сацыялістычнае спаборніцтва. Стаўшы па свайму размаху і глыбіні сапраўды ўсенародным, спаборніцтва пастаянна нараджае ўзоры творчай працы, служыць добрую службу развіццю эканомікі краіны». Адной з асаблівасцей цяперашняга этапа спаборніцтва з'яўляецца тое, што побач з працаўнікамі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту і іншых галін у яго актыўна ўключыліся калектывы вышэйшых навучальных устаноў, навукова-даследчых і праектна-канструктарскіх арганізацый.

Калектыў БДУ імя У. І. Леніна ў трэцім годзе пяцігодкі ўключыўся ў сацыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу 61-й гадавіны Вялікага Кастрычніка і 60-годдзя БССР і КПБ, асноўную ўвагу ўдзяляў пытанням далейшага ўдасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэнню тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню правядзення ўсіх відаў вучэбных заняткаў са студэнтамі, вывучэнню, абагульненню і ўкараненню перадавога вопыту, які назапасілі ВНУ краіны, рэспублікі і універсітэт, і на гэтай аснове паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у адпаведнасці з патрабаваннямі навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Пастаянна ў цэнтры ўвагі рэктарата, парткома, мясцкома, камітэта камсамола, дэканатаў, партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый факультэтаў як арганізатараў сацыялістычнага спаборніцтва былі таксама пытанні павышэння эфектыўнасці навуковых даследаванняў, павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта.

Усе кафедры універсітэта, саветы факультэтаў, навукова-метадычны савет універсітэта вялікую ўвагу ўдзялялі пытанням удасканалення методыкі выкладання, павышэнню якасці лекцый і іншых форм заняткаў.

Прафесарска - выкладчыцкім саставам за 1978 год выдадзена больш як 300 вучэбна-метадычных дапаможнікаў і распрацовак для студэнтаў усіх форм навучання. Распрацавана і ўдасканалена 175 спецкурсаў, 95 лабараторных работ.

Творчае супрацоўніцтва з прамысловымі прадпрыемствамі і навукова-даследчымі інстытутамі АН БССР дазволіла ўвесці ў 1977-78 навучальным годзе новыя спецыялізацыі: мікраэлектроніка (для ВА «Інтэграл»), аўтаматызацыя навуковых даследаванняў і радыяцыйнае матэрыялазнаўства (для НДІ АН БССР).

У вучэбным працэсе ўсё большае месца займаюць тэхнічныя сродкі навучання, іх комплекснае прымяненне. Ва ўніверсітэце 54 памяшканні абсталяваны ТСН.

На ўсіх факультэтах праведзена работа па давядзенню да кожнага студэнта вучэбных планаў і праграм на ўвесь навучальны год. Шырокая работа вядзецца па ўдасканаленню кантролю за самастойнай работай і бягучай паспяховасцю студэнтаў, іх вучэбнай дысцыплінай.

Усё гэта і рад іншых мерапрыемстваў забяспечылі па універсітэту ў 1978 годзе 94,1 працэнта абсалютнай паспяховасці (у 1977 годзе — 93,7 працэнта).

Ёсць ва універсітэце поспехі ў развіцці і павышэнні эфектыўнасці навуковых даследаванняў. У 1978 годзе ў параўнанні з 1977 годам паменшылася колькасць тэм па кафедральнай тэматыцы (са 157 да 112). Адначасова ўзрасла колькасць тэм па важнейшай тэматыцы. У 1978 годзе было запланавана закончыць 85 тэм, фактычна выканана 94 тэмы. Вучонымі кафедр грамадскіх і гуманітарных навук выдадзен рад работ, атрымаўшых прызнанне навуковай грамадскасці.

Важныя вынікі дасягнуты і ў галіне прыродазнаўчых навук. Сярод іх ёсць работы, удастоеныя Дзяржаўнай прэміі БССР, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, прэміі імя С. І. Вавілава і інш.

Падводзячы вынік навукова-даследчай работы, неабходна адзначыць, што агульны аб'ём навукова-даследчых работ склаў 9 млн. 561,3 тыс. рублёў, у тым ліку 7 млн. 146,6 тыс. рублёў па гасдагаворах. Гэта адпаведна 103,8 і 104,1 працэнта ў адносінах да мінулага года.

Пацверджаны вытворчасцю эканамічны эфект ад укаранення вынікаў навуковых работ склаў 6 млн. 29,5 тыс. рублёў (пры плане 5 млн. 33 тыс. рублёў). У 1977 годзе мы атрымалі пацверджаны эканамічны эфект 4 млн. 690,7 тыс. рублёў.

Пэўныя поспехі ёсць і ў навуковай рабоце студэнтаў. Так, дзяржаўнымі экзаменацыйнымі камісіямі рэкамендавана да ўкаранення і да друку 15 працэнтаў дыпломных работ, якія былі абаронены ў 1977-78 навучальным годзе (у 1976-77 навучальным годзе — 11,5 працэнта).

У 1978 годзе амаль усе сту-



Лабараторную работу па методыцы выкладання фізікі праводзяць чацвёртакурснікі фізічнага факультэта.

Фота М. Дубовіка.

## ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

### Курс на сяброўства

З 23 па 25 сакавіка ў Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі праходзіў семінар-вучоба камандзіраў і камісараў лінейных студэнцкіх будаўнічых атрадаў Мінскай вобласці. У ім прынялі ўдзел і прадстаўнікі універсітэцкіх СБА.

Асноўная ўвага на семінары была ўдзелена пытанням арганізацыі работы атрадаў у падрыхтоўчы перыяд. Аб вопыце, назапашаным у час падрыхтоўкі да працоўных семестраў мінулых гадоў, аб планах і справах сваіх атрадаў у гэтым годзе расказалі камандзіры і камісары лепшых універсітэцкіх СБА імя Ленінскага камсамола і імя акадэміка Нікольскага Уладзімір Карагін і Пётр Аксючыц, Ігар Велічанскі і Валянцін Голубеў. Іх выступленні выклікалі вялікі інтарэс удзельнікаў семінара. Вопыт гэтых атрадаў быў рэкамендаван для вывучэння і выкарыстання іншымі атрадамі вобласці.

1979 год упіша ў біяграфіі СБА імя Ленінскага камсамола і імя акадэміка Нікольскага новую старонку. Месцам дыслакацыі атрадаў стане траса БАМа ў Паўднёвай Якуціі.

На аб'яднаным пасяджэнні штабаў гэтых атрадаў, якое было праведзена адразу пасля семінара, вырашана заключыць дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве і супрацоўніцтве паміж атрадамі.

Дагавор прадугледжвае стварэнне аб'яднанага штаба зводнага універсітэцкага атрада на тэрыторыі Якуцкай АССР, правядзенне сумесных пасяджэнняў, падрыхтоўку канцэртных праграм агітбрыгад, супрацоўніцтва ў прапагандзе студэнцкага будаўнічага руху, планаванне і правядзенне найбольш важных грамадска-палітычных мерапрыемстваў, узаемадапамогу і абмен спецыялістамі ў працоўны перыяд.

Дагавор быў адобран байцамі будаўнічых атрадаў імя Ленінскага камсамола і імя акадэміка Нікольскага.

Н. СЯРГЕЕЎ.

### З вякоў мінулых

Вось і прыйшла вясна. Прыйшла і прынесла з сабой шматлікія вясновыя клопаты. Немалаважную ролю адыгрываюць сярод іх мерапрыемствы, якія праводзяць у падрыхтоўчы перыяд байцы будаўнічых атрадаў: гэта і праца на суботніках, і лекцыйная работа, і выпуск насценгазет, і падрыхтоўка мастацкай самадзейнасці, і іншае. Займаючыся ўсім гэтым, мы, байцы будаўнічага атрада імя У. І. Пічэты, міжвольлі ўспамінаем мінулае працоўнае лета.

Раніца, 7.30. На ўсю моц дзесяціватавага дынаміка гучыць па другому паверху інтэрната «Гімн узыходзячаму сонцу». Пад'ём. Праз некалькі хвілін з умывальнага пакою чуваць фырканне і смех хлопцаў — халадна, але прыемна.

8.00 — лінейка: камандзір акрэслівае задачы на дзень, а ты ўжо рыхтуешся да забегу на 300 метраў — кожны хоча трапіць у сталовую як мага раней.

9.00 — узброеныя рыдлёўкамі, насілкамі, ламамі і кельмамі, мы прымаемся за працу. Аб'ект у нас цікавы і незвычайны — замак XIV стагоддзя.

Мы — археолагі і будаўнікі-рэстаўратары. Гучыць прыгожа і ганарова. І мы імкнёмся не зганьбіць гэтыя прафесіі. Праца ідзе хутка і зладжана, і вынікі ўжо можна ўбачыць: гэта і шахматная ладдзя XVI стагоддзя, зробленая са слановай косці, і каменныя ядры, і каштоўная кераміка, і манеты часоў Сігізмунда-Аўгуста. Лепш за ўсё раскопы відаць зверху, адтуль, дзе нашы хлопцы-муляры на чале з Сяргеем Салаўёвым кладуць новы цагляны пояс на сценах замка.

Працуем да 19.00, потым гуляем у валейбол з байцамі будаўнічага атрада «Юнацтва-78»; рыхтуемся да канцэртаў (дарэчы, мы іх правялі 7), ходзім на экскурсіі, слухаем лекцыі па архітэктуры, мастацтву, гіпнозу (з паказам эксперыментаў), ходзім у кіно, праводзім атрадныя і міжатрадныя вечары адпачынку. А ў выхадныя дні ў нас канцэрты, сустрэчы з ветэранамі вайны, спартыўныя спаборніцтвы, паездка ў горад Вільнюс і Тракайскі замак, атрадны медыум, дзень пасвячэння ў археолагі і шмат іншага.

Калі мы ад'язджалі з Ліды, то, як сказала сакратар гаркома партыі Н. П. Папова, нават дожджык плакаў ад тугі. Здавалася, ён выказваў і наш настрой — вельмі ж ужо не ха-

дэнты прынялі ўдзел у I і II турах алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс», прысвечанай 60-годдзю ВЛКСМ, і занялі чатыры першыя камандныя месцы (па хіміі, фізіцы, матэматыцы, рускай мове). У асабовым заліку студэнты занялі 20 прызавых месц: 11 — першых, 7 — другіх і 2 — трэціх.

Ва універсітэце з 1967 года працуе савет маладых вучоных. Ён аб'ядноўвае 11 факультэцкіх саветаў і 4 саветы навуковых падраздзяленняў і кафедр грамадскіх навук. Работа савета ў снежні 1978 года абмяркоўвалася на бюро савета маладых вучоных пры ЦК

# РУБЯЖОЎ

**СПАБОРНІЦТВА КАЛЕКТЫВУ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ЗА 1978 ГОД.)**

ЛКСМБ і атрымала станоўчую ацэнку. У 1978 годзе маладыя вучоныя здзяйснялі кіраўніцтва 26 гасдагаворнымі тэмамі, курыравалі школы «юных», правялі 4 міжвузаўскія навуковыя канферэнцыі. Маладымі вучонымі ў бягучым годзе атрыманы 1 прэмія Ленінскага камсамола Беларусі, 4 прэміі рэспубліканскага агляду работ па грамадскіх навуках, медаль імя С. І. Вавілава Міністэрства прыборабудавання СССР, прэмія Мендзялееўскага таварыства СССР.

Гэтыя поспехі калектыву універсітэта ў сацыялістычным спаборніцтве па дастойнай сустрэчы 60-годдзя БССР і КПБ высока адзначаны ўрадам нашай рэспублікі. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Камсамольская арганізацыя універсітэта, якая заняла першае месца сярод ВНУ рэспублікі, Мінскай вобласці і г. Мінска па выніках трэцяга працоўнага семестра, узнагароджана пераходным Чырвоным сцягам Мінскага абкома партыі і аблвыканкома.

У адпаведнасці з «Палажэннем аб сацыялістычным спаборніцтве калектыву ў дзесятай пяцігодцы — пяцігодцы якасці і эфектыўнасці» камісія універсітэта падвяла вынікі сацыялістычнага спаборніцтва сярод факультэтаў і агульнауніверсітэцкіх кафедр. Пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва сярод факультэтаў прызнаны:

**біялагічны факультэт, які заняў першае месца;**

**хімічны факультэт, які заняў другое месца;**

**фізічны і гістарычны факультэты, якія занялі трэцяе месца.**

Сярод агульнауніверсітэцкіх кафедр:

**першае месца прысуджана кафедры педагогікі;**

**другое месца—кафедры гісторыі філасофіі і логікі;**

**трэцяе месца—кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў.**

Вынікі вызначаліся на суме месц, якія занялі калектывы па вучэбнай, вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і грамадска-палітычнай рабоце.

Мы добра разумеем, што падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва — гэта не толькі вызначэнне пераможцаў. Задача заключаецца і ў тым, каб выявіць адстаючыя ўчасткі ў нашай рабоце, мабілізаваць прафесарска-выкладчыцкі састаў і ўсіх супрацоўнікаў універсітэта на іх пераадоленне.

Вядома, што канчатковым вынікам усёй нашай дзейнасці, паказчыкамі, якія вызначаюць эфектыўнасць вучэбнай, вучэбна-метадычнай работы, грамадска-палітычных мерапрыемстваў і ў значнай ступені навукова-даследчай работы, з'яўляецца паспяховасць студэнтаў. Якія ж паказчыкі паспяховасці на факультэтах за 1978 год? Абсалютная паспяховасць у пяці факультэтаў — радыёфізікі і электронікі, ФПМ, фізічнага, філалагічнага і механіка-матэматычнага ніжэй агульнауніверсітэцкага ўзроўню. Адносна невысокі ўзровень выдатнікаў на геаграфічным, філалагічным, юрыдычным факультэтах, на факультэце прыкладной матэматыкі. Некалькі знізілася колькасць студэнтаў, якія атрымалі выдатныя і добрыя адзнакі. Па-ранейшаму на першых курсах абсалютная паспяховасць ніжэй, чым на старэйшых курсах. На першых курсах і самая вялікая колькасць нездавальняючых адзнак.

Гэта абавязвае факультэты сур'ёзна падумаць і здзейсніць сістэму мер па павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

Усё яшчэ марудна ўкараняюць кафедры тэхнічныя сродкі навучання і праграміраваныя метады навучання. Напрыклад, на механіка-матэматычным факультэце толькі 19 працэнтаў выкладчыцкага саставу выкарыстоўваюць тэхнічныя сродкі, машыннае і безмашыннае праграміраванае навучанне. На факультэце радыёфізікі і электронікі — 46,9 працэнта; на філалагічным — 64 працэнты; на гістарычным — 65 працэнтаў. Яшчэ горшыя паказчыкі выкарыстання кіно ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Большай увагі патрабуе работа кафедр па выпрабу вучэбных кінафільмаў, дыяфільмаў і дыяпазітываў.

Такім чынам у вучэбнай і вучэбна-метадычнай рабоце ёсць цэлы шэраг праблем, рашэнне якіх дапаможа значна палепшыць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў.

Ёсць недахопы і ў навукова-даследчай рабоце. У 1978 годзе ва універсітэце не абаронена ніводнай доктарскай дысертацыі. Толькі на 93,7 працэнта выканан план прыёму ў аспірантуру. Са 123 аспірантаў толькі пяць закончылі аспірантуру з абаронай дысертацыі.

Не ў поўнай меры выкарыстоўваецца навуковы патэнцыял факультэтаў. Аб гэтым сведчыць параўнанне ўдзельнай вагі тэм па важнейшай тэматыцы і навуковага патэнцыялу факультэтаў. Так, фізічны факультэт займае другое месца па навуковаму патэнцыялу і толькі чацвёртае — па ўдзельнай вазе важнейшай тэматыкі. Механіка-матэматычны факультэт — шостае месца па навуковаму патэнцыялу і дзявятае — па важнейшай тэматыцы і г. д.

Як вядома, навука стала непасрэднай вытворчай сілай. Адным з паказчыкаў эфектыўнасці навукова-даследчай работы з'яўляецца эканамічны эфект, які атрыман народнай гаспадаркай ад укаранення ў вытворчасць навукова-даследчых работ. Як жа выглядаюць гэтыя паказчыкі на факультэтах, якія вядуць прыкладныя даследаванні. Эканамічны эфект склаў на адзін рубель затрат: фізічны факультэт — 1,11; ФПМ — 0,56; факультэт радыёфізікі і электронікі — 0,32; хімічны — 0,17.

Гэта яшчэ раз сведчыць аб неэфектыўным выкарыстанні навуковага патэнцыялу факультэтаў.

Ведучы размову аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва, неабходна адзначыць, што ў яго змесце ўсё большае значэнне набывае і грамадска-палітычная работа. У 1978 годзе праведзены агляды-конкурсы: мастацкай самадзейнасці, нагляднай агітацыі, конкурс на лепшую студэнцкую акадэмічную групу, агульнауніверсітэцкая спартакіяда. Глыбока была прааналізавана работа кожнага факультэта ва універсітэцкім таварыстве «Веды». Усё гэта было ўлічана пры падвядзенні вынікаў работы кожнага факультэта.

Працэс падвядзення вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва паказаў, што неабходна ўдасканаліць дзеючае палажэнне аб сацыялістычным спаборніцтве ў двух напрамках:

па-першае, неабходна паменшыць колькасць паказчыкаў, пакінуць толькі тыя, якія фіксуюць канчатковыя вынікі нашай дзейнасці;

па-другое, наспела неабходнасць распрацаваць асобныя палажэнні дастасоўна да прыродазнаўчых і гуманітарных факультэтаў.

Няма яшчэ ва універсітэце практыкі заключэння ўзаемных дагавораў аб спаборніцтве паміж кафедрамі, лабараторыямі, факультэтамі. А іменна ў гэтым — магчымасць забяспечыць найбольшую галоснасць і параўнальнасць, магчымасць найбольш дакладна ўлічыць працоўны ўклад кожнага падраздзялення ў агульны вынік работы універсітэта.

Дух сапраўднага саперніцтва ўзнікае толькі тады, калі на кожным факультэце, паміж факультэтамі, ва ўсім універсітэце галоўным стымулам у творчай дзейнасці стане імкненне нашых працаўнікоў змагацца за прызавыя месцы ў індывідуальным спаборніцтве, за права называцца лепшай кафедрай, лепшай лабараторыяй універсітэта. Зразумела, што такая магчымасць паявіцца тады, калі будзе адпрацавана сістэма аб'ектыўных крытэрыяў ацэнкі работы кожнага ўчастка і падраздзяленняў у цэлым.

На лістападаўскім (1978 г.) Пленуме ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў адзначаў: «Нам не патрэбны шум і траскатня па прычыне спаборніцтва. Нам патрэбна жывая зацікаўленасць кожнага працоўнага калектыву ў паляпшэнні сваёй работы... Кіраўніцтва спаборніцтвам, укараненне новага, прагрэсіўнага — справа жывая, якая не церпіць застою і кансерватызму».

Іменна ў такім духу і належыць нам працаваць, іменна так арганізоўваць сацыялістычнае спаборніцтва.

**А. МАЛЫШАЎ,**
**прарэктар па вучэбнай рабоце.**

---

целася нам развітвацца з горадам, з замкам, з нашым атрадам.

Не заўважылі мы, як праляцелі 6 месяцаў вучобы, і хутка ўжо пачнецца чарговы трэці працоўны семестр. Правядзём мы яго зноў разам — наш атрад «Кастрычнік» складаецца ў асноўным з тых дзяўчат і хлопцаў, якія працавалі мінулым летам у саставе атрада імя У. І. Пічэты.

А пакуль што трэба шмат працаваць, і мы працуем: падбірае рэпертуар для агітбрыгады Лена Гулевіч — і вясёлыя песні разносяцца па шостаму паверху галоўнага корпуса; малююць насценгазеты і афармляюць стэнды Іра Якуш і Саша Бацэка, рыхтуе спартыўны інвентар Сяргей Кучынскі; але больш за ўсё клопатаў у Сяргея Салаўёва і Андрэя Свірко — камандзіра і камісара. Нагогул, працуюць усе, і хочацца спадзявацца, што гэта адпаведным чынам адаб'ецца на справах атрада летам, калі нам прыйдзецца трымаць яшчэ адзін экзамен на грамадскую сталасць — экзамен працай.

Дзень добры, студэнцкі будаўнічы атрад-79!

**С. БАРОЎСКІ,**
**баец будаўнічага атрада «Кастрычнік».**



**Збылася мара Інхбата Луўсангомбы з Мангольскай Народнай Рэспублікі — ён атрымаў магчымасць вучыцца ў Савецкім Саюзе, на радзіме вялікага Леніна. Разам з новымі сябрамі, першакурснікамі факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, ён спасцігае таямніцы жаданай прафесіі.**

Фота **М. Дубовіка.**

---

# УЗАЕМАРАЗУМЕННЕ

## (ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ ТЭАТРА)

РАМПА

Сустрэчы з цікавымі людзьмі на журфаку — з'ява прывычная. Частымі гасцямі тут бываюць вядомыя празаікі, паэты, журналісты, артысты і г. д. Але гэтая сустрэча асабліва захапіла нас сваёй непасрэднасцю, шчырасцю, сур'ёзнасцю, поўным узаемаразуменнем. І не дзіўна: рэжысёр і акцёры маладзёжнага тэатра сустрэліся з маладымі гледачамі, сярод якіх, магчыма, былі і будучыя тэатральныя крытыкі.

Новы спектакль Тэатра юнага гледача, пастаўлены рэжысёрам Юрыем Міроненкам па казцы аўстрыйскага пісьменніка Ф. Залтана «Бэмбі», з'явіўся падзеяй у тэатральным жыцці Мінска. Ён прыцягнуў асаблівую ўвагу маладога гледача. Зараз, калі сыграна ўжо некалькі спектакляў, можна з упэўненасцю сказаць, што гэта пастаноўка — сапраўдная ўдача тэатра.

Больш паловы журфакаўцаў паглядзелі «Бэмбі». Ён выклікаў зацікаўленасць у студэнтаў-філосафаў, філолагаў, фізікаў — гэта толькі ва універсітэце. А інстытут культуры, тэатральны... Згадзіцеся, што не кожны спектакль адразу ж пасля паяўлення карыстаецца папулярнасцю ў моладзі.

Не ўсе ўспрымаюць пастаноўку станоўча. «Бэмбі» выклікае спрэчкі, супярэчлівыя погляды, але ж гэта і вызначае сапраўдны твор мастацтва. Мне давялося чуць розныя водгукі аб прэм'еры, але, бадай, у адным яны супадаюць, у тым, што спектакль прыносіць сапраўдную эстэтычную асалоду. У гэтым «Бэмбі» выгадна адрозніваецца ад іншых работ, нават у тым жа Тэатры юнага гледача. Галоўнае — гэта якраз той спектакль, які прымушае гледача быць саўдзельнікам творчага працэсу.

Няхай кожны ўспрыняў прэм'еру па-свойму, няхай пасля яе ўзнікае мноства пытанняў, але на спектаклі не шушукаюцца, не шамацяць паперкамі ад цукерак... Над «Бэмбі» думаюць. Думаюць у тэатральнай зале і пасля наведання тэатра, спрачаюцца з сябрамі ці проста ўспамінаюць сцэны са спектакля, успамінаюць і адкрываюць іх для сябе па-новаму. Гэта — лепшы доказ поспеху тэатра, галоўная ўзнагарода стваральнікам спектакля, якія сумелі страсна, эмацыянальна, не прымітыўна звярнуцца да гледача і пакарыць яго.

І вось зараз рэжысёр спектакля Юрый Міроненка, выканаўца ролі Бэмбі Сяргей Журавель, Валерый Легін і Лізавета Катковіч (выканаўцы галоўных ролей у спектаклі) і загадчык педагагічнай часткі тэатра Валянціна Шымановіч расказалі зацікаўленай аўдыторыі аб творчым працэсе стварэння спектакля. Гутарка праходзіла ажыўлена. Гаварылі аб адзінстве слова, пластыкі, музыкі і святла ў спектаклі, аб асацыяцыях, якія ўзнікалі, аб акцёрскіх работах, аб тым, што ў пастаноўцы не разумеюць, не прымаюць, і аб тым, чым захапляюцца. Педагог тэатра В. Шымановіч расказала аб аўдыторыі, якой адрасаван спектакль.

Скончылася наша гутарка, сказаны ўсе словы ўдзячнасці ўдзельнікам пастаноўкі. Разыходзяцца, абменьваючыся ўражаннямі, студэнты. Да мяне далятае: «Калі будзе зноў ісці гэты спектакль? Абавязкова пагляджу яшчэ раз!»

**С. ШАБАН,**
**студэнтка журфака.**




У прынятай у снежні 1978 года пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб дадатковых мерах па ўзмацненню аховы і паляпшэнню выкарыстання прыродных рэсурсаў» побач з многімі іншымі мерапрыемствамі падкрэслена неабходнасць узмацнення прапаганды ведаў па ахове прыроды і рацыянальнаму выкарыстанню і ўзнаўленню яе рэсурсаў.

У сувязі з гэтым партком і рэктарат БДУ імя У. І. Леніна прынялі рашэнне аб арганізацыі ў бягучым навучальным годзе народнага універсітэта «Прырода», мэтай якога з'яўляецца, побач з павышэннем агульнаэкалагічных ведаў слухачоў, падрыхтоўка іх да правядзення прапагандысцкай работы сярод насельніцтва па праблемах аховы навакольнага асяроддзя.

# НАРОДНЫ УНІВЕРСІТЭТ «ПРЫРОДА»

У бягучым навучальным годзе народны універсітэт «Прырода» працуе па пяцідзесяцігадзіннай праграме, якая прадугледжвае цыкл лекцый па найбольш актуальных праблемах сучаснага стану біясферы, рацыянальнага выкарыстання, узнаўлення і аховы яе сыравінных і біялагічных рэсурсаў. Акрамя таго, запланавана азнаямленне з арганізацыяй работы аднаго з запаведнікаў Беларусі (Бярэзінскага ці Белавежскай пушчы) і Батанічнага сада АН БССР.

Лекцыі ў народным універсітэце чытаюць найбольш кваліфікаваныя спецыялісты ў галіне агульнабіялагічных і экалагічных праблем. Сярод іх 17 дактароў навук, якія працуюць у АН БССР, БДУ імя У. І. Леніна, хіміка-тэхналагічным інстытуце імя С. М. Кірава і іншых.

У ліку лектараў рэктар хіміка-тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава прафесар В. С. Раманаў, старшыня навуковага савета па праблеме «Чалавек і біясфера» член-карэспандэнт АН СССР Л. М. Сушчэня, дырэктар інстытута эксперыментальнай батанікі АН БССР прафесар В. І. Парфёнаў, загадчыкі лабараторый АН БССР дактары навук М. С. Долбік, А. В. Бойка, дэкан геаграфічнага факультэта М. Т. Раманоўскі, дэкан біялагічнага факультэта прафесар А. Ц. Пікулеў, загадчыкі кафедраў прафесары: А. Г. Мядзведзеў, В. Ф. Якушка, Ю. К. Фамічоў і інш.

Важным раздзелам работы народнага універсітэта «Прырода» з'яўляецца ўкамплектаванне яго слухачоў. У бягучым навучальным годзе залічана 123 чалавекі, сярод якіх 45 дацэнтаў, старшых выкладчыкаў, асістэнтаў, старшых і малодшых навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў, 43 інжынеры, тэхнікі і старшыя лабаранты і 45 студэнтаў старэйшых курсаў.

У асноўным кантынгент слухачоў народнага універсітэта «Прырода» ўкамплектаван супрацоўнікамі і студэнтамі біялагічнага, геаграфічнага, фізічнага і хімічнага факультэтаў. У рабоце універсітэта прымаюць удзел і студэнты факультэта журналістыкі. Слухачы сістэматычна наведваюць заняткі і праяўляюць вялікую актыўнасць. Сярод найбольш актыўных трэба адзначыць групу геаграфічнага факультэта, якую ўзначальвае старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі возеразнаўства А. Н. Рачэўскі; кіраўніка групы фізічнага факультэта дацэнта В. І. Крата, кіраўніка групы біялагічнага факультэта асістэнта Н. В. Лугініна, кіраўніка групы студэнтаў хімічнага факультэта Е. Шубіну, аспіранта В. Л. Тарасевіча, студэнтаў IV курса, якія спецыялізуюцца па ахове прыроды і гідрабіялогіі М. Багалейка, Г. Пракаповіча і інш.

За прайшоўшыя чатыры месяцы работы народнага універсітэта «Прырода» разам з назапашваннем некаторага вопыту работы ўзніклі і новыя праблемы, якія неабходна вырашыць для паспяховага завяршэння бягучага і падрыхтоўкі да новага навучальнага года. Перш за ўсё неабходна ўнесці некаторыя карэктывы ў вучэбна-тэматычны план, надаць яму больш мэтанакіраваны характар і вырашыць праблему ўкамплектавання універсітэта слухачамі на новы навучальны год, пазбегнуць разнабою ў профілі падрыхтоўкі паступаючых. На наш погляд, паявілася неабходнасць выдання ў якасці дапаможніка для будучых прапагандыстаў цыкла лекцый, якія чытаюцца ў народным універсітэце «Прырода», Улічваючы, што лекцыі чытаюцца на высокім навукова-метадычным узроўні, гэты дапаможнік будзе шырока выкарыстоўвацца многімі людзьмі, якія выступаюць перад насельніцтвам з лекцыямі па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя.

**П. ПЯТРОВІЧ,**
**рэктар**
**народнага універсітэта**
**«Прырода».**

НАЗІРАННІ

## Сляды чалавечыя

Чалавек ходзіць па зямлі, пакідае за сабою сляды. І такая ўжо ў яго звычка — не заўважаць таго, што застаецца за спіною. Ён толькі зрабіў некалькі крокаў, цар прыроды, — а нешта ўжо змянілася ў быцці наваколля, у быцці братоў нашых меншых.

У Паўночнай Амерыцы быў выпадак, калі нехта без аніякай патрэбы пабіў за суткі са стрэльбы сотні бізонаў. Вельмі ж ганарыўся «ўдалы паляўнічы» подзвігам сваім і ўпотай спадзяваўся, што імя яго застанецца надоўга ў аналах гісторыі. І чалавецтва ўспомніла яго імя...

Быў другі — выплюхнулі па трубах у ціхую рачулку Сіняўку тоны атручанай вадкасці. Блішчэла на паверхні вады ўсплыўшая рыба, абураліся рыбаловы.

Колькі іх, такіх выпадкаў?

Сляды, сляды...

## Мурашнік

Карп Захаравіч — добры тоўсты чалавек, і злосці ў сэрцы не мае, і наўмысна нікога не пакрыўдзіць. Толькі аднойчы ў вясёлым настроі расклаў вогнішча ў лесе, скакаў і гукаў ля агню, весяліўся і не заўважаў, як патрушчыў чаравікам маленькі мурашнік.

Яркім золатам пырснулі з-пад абцаса мурашыныя яйкі. Мітусіліся сярод руінаў мурашкі...

## Бульбіна

Ляжала пры дарозе бульбіна — не проста бульбіна, а церам-церамок. У баку ў яе дзірачка прагрызена, унутры — утульныя пячоркі, а ў пячорках макрыцы жывуць. Кволыя, бяскрыўдныя істоты — шматногія, з доўгімі вусікамі, каб усё абмацваць. Дзе жылі, там і харчаваліся яны.

Узімку іх снегам прысыпала, так і перазімавалі, пражылі сцюжы і завеі.

## Карась і бабулька

Ляжаў карась у пухкай твані, зарыўшыся ў мяккі глей, як у коўдру. Сніў салодкія сны, а калі нешта вялікае, бліскучае плюхнула ў ваду побач з ім, — зацікавіўся.

Нешта цьмяна блішчэла, і там быў надпіс: «Грэчневая каша з мясам». І хоць карась быў непісьменны, а ўсё ж сцяміў, што тут нешта спажыўнае.

Зачвякаў ён тлустымі губамі, абіраючы зернейкі... Наеўся і стаў быццам п'яны. Падплываў шчупак, хацеў карася з'есці, але не ўдалося. Перашкаджала нешта цвёрдае, празрыстае...

Па беразе ішла бабулька, заўважыла ў вадзе слоік, выцягнула, хацела ўжо — у торбу, аж бачыць у ім залацістую рыбіну. Лупавока глядзіць п'яны карась...

— А родненькі ты мой, каб жа вас тут шмат было!.. А плыві ж ты, даражэнькі, у возера.

Пайшоў карась гуляць на свабоду...

**П. ВАСЮЧЭНКА.**

**Вярба вясну вітае...**

Фота **Т. Сахашчык.**



# АБ ЗЯЛЁНЫМ СЯБРУ

Кніга «Камсамол і ахова прыроды» (Е. Лысенка, І. Цярэнцьеў. Масква. «Молодая гвардия», 1978 г.) расказвае аб развіцці ў нашай краіне руху моладзі за ленінскія адносіны да прыроды, аб барацьбе за ахову навакольнага асяроддзя.

Рускі лес. Горныя крыніцы Каўказа. Запаведная прыгажосць прыроды Беларусі, Прыбалтыкі, Украіны... Родная прырода—паняцце, глыбока сугучнае з паняццямі Радзіма, Бацькаўшчына. Няма справы высакародней, чым служэнне прыродзе.

Мы вельмі часта гаворым аб пакарэнні прыроды чалавекам, памятаем і аб тым, што яно павінна быць разумным. Прырода не павінна пакутаваць ад нашых перамог над ёй. Таму вельмі патрэбна сур'ёзная прапаганда навуковых ведаў аб прыродзе, аб яе ахове.

Аўтары кнігі ўздымаюць шэраг праблем. Гэта — пераўтварэнне нашых гарадоў у квітнеючыя сады. Зялёны горад, нават калі ён старажытны, — заўсёды малады. Але адна справа пасадзіць дрэвы, другая — вырасціць іх. Яшчэ сустракаецца і такое, калі парк, пасаджаны вясной, за лета гіне, таму што яго ніхто не даглядаў.

Чалавечы розум пакарыў энергію атама, пранік у космас, разгадаў гісторыю мінулага, аднавіў помнікі старажытнай культуры. Але бяссільны чалавек аднавіць зніклы на зямлі той ці іншы від жывёл ці раслін. Галоўная прычына гібелі вялікай колькасці відаў раслін і жывёл—неразумнае ўмяшанне чалавека ў справы прыроды. Наш абавязак — весці барацьбу за кожнае дрэва, за вялікую рэчку і крынічку, за кожную птушку і звера.

Заводы, электрастанцыі, сотні мільёнаў аўтамабіляў— гэта тоны вуглякіслага газу, попелу, мыш'яку, цынку і іншых ядавітых рэчываў. Праблема паўстае яшчэ больш востра, таму што навакольнае асяроддзе зямнога шара забруджваецца прадуктамі радыёактыўнага распаду, якія ўтвараюцца ў выніку выпрабаванняў атамнай зброі. Савецкі Саюз першым выступіў з прапановай аб забароне атамнай зброі. На XXV з'ездзе КПСС гаварылася аб распрацоўцы новых метадаў барацьбы са шкоднымі выкідамі ў атмасферу.

Прырода — асноўны сродак існавання чалавека. Чаму ж мы часам так жорстка адносімся да яе? «Прырода —маці», — пісаў вялікі В. Гюго, а з маці трэба абыходзіцца беражліва, з вялікай любоўю і павагай.

Надышла вясна. І вельмі не хацелася б бачыць, прыйшоўшы ў лес, іржавыя кансервавыя бляшанкі, паламаныя галінкі дрэў і заваленую смеццем крыніцу (сляды «дзікіх» падарожнікаў). Няхай жа лес сустрэне нас пяшчотным пахам першых пралесак і ландышаў, спевам птушак і цурчаннем чыстай крыніцы.

Аб усім гэтым расказвае новая кніга Е. Лысенкі і І. Цярэнцьева.

**Т. ЛУНЕВІЧ,**
**студэнтка вячэрняга**
**аддзялення журфака.**

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Заказ № 504

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 03757